Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 САКАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 53 (27911) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Купіць бярозавік па-ранейшаму няпроста**
СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**



**Непедагагічная паэма**
СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя:**

*«У краіне ў гэтым годзе будзе вырашана праблема кадравага дэфіцыту ўрачоў: зараз ва ўстановах аховы здароўя іх не хапае 2,5 тысячы. Сёлета будзе размеркавана 3,2 тысячы маладых спецыялістаў. Такім чынам будзе знята кадравае пытанне ва ўсіх рэгіёнах краіны. У першую чаргу выпускнікі будуць размеркаваны ў першаснае звяно — амбулаторна-паліклінічныя ўстановы. Што тычыцца заработнай платы медыцынскіх работнікаў, то ў гэтым годзе яна будзе павышацца пераважна за кошт аптымізацыі сістэмы аховы здароўя і эканоміі бюджэтных сродкаў. Сэканомленыя сродкі пойдуць на матэрыяльнае стымуляванне медперсаналу і на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14760,00 | ▼ |
| Еўра | 15820,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 246,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 632,12 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Нясумная гаспадарка





Фота БЕЛТА.

**На падворку Настассі і Аляксандра Шаўчэнкаў, якія жывуць у пасёлку Тулава пад Віцебскам, сумна не бывае. Не гаспадарка, а сапраўдны міні-заапарк. Тут і вярблюд, і чатыры поні, і коні, і вослік. А нядаўна з'явіўся яшчэ адзін экзатычны гадаванец — паўночны алень...**

■ Спецыяльны рэпартаж

## «НЕЛЬГА БЫЦЬ ЗЛЫМ, ГАЛОДНЫМ І АДЗІНОКІМ»

### Як беларусы лечацца ад залежнасцяў

**Днямі з'явілася навіна, што Міністэрства гандлю збіраецца абмежаваць час продажу спіртнога. Набываць выпіўку ў перспектыве можна будзе з 9.00 да 22.00. З улікам нашай сумнай алкагольнай статыстыкі, захад сапраўды слушны. Не верыце, што алкагалізм маладзее, а наркотыкі даступныя школьнікам? Зазірніце ў аддзяленне наркалогіі. Там пераважна юнакі. Некаторыя, праўда, хочуць вылечыцца. Так, у 21-е рэабілітацыйнае наркалагічнае аддзяленне РНПЦ псіхічнага здароўя па дапамогу звяртаюцца людзі з алкагольнай, наркатычнай і гульнявой залежнасцю. Як выпівохі стрымліваюць сябе, каб не пайсці ў запой, і чаму на спайс «падсаджваюцца» школьнікі, чытайце ў нашым рэпартажы.**

СТАР. 4

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

## ПАДАРУНАК ДА СВЯТА

### Ветэраны вайны ў найбліжэйшы месяц атрымаюць матэрыяльную дапамогу

**Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта. Днямі кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 126 «Аб аказанні матэрыяльнай дапамогі», дзе вызначаны памеры аднаразовых выплат для кожнай з катэгорый ветэранаў.**

Па 10 мільёнаў рублёў атрымаюць Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, якім прысвоілі гэта званне за заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны, узнагароджаныя ордэнамі Славы трох ступеняў. Інвалідам і ўдзельнікам ВАВ, што абаранялі дзяржаву да 3 верасня 1945-га, і асобам са складу спецыяльных фарміраванняў, якія займаліся размініраваннем тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах, налічаць па восем мільёнаў рублёў. Аднаразовую дапамогу ў памеры трох з палавой мільёнаў акажуць пенсіянерам, узнагароджаным ордэнамі ці медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную вайсковую службу ў тыле, тым, хто працаваў на аб'ектах у тылавых межах франтоў, блакаднікам Ленінграда, былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў і гета і іншым грамадзянам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны.

Выплачвацца матэрыяльная падтрымка будзе з 1 красавіка да 1 мая. Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, на гэтыя мэты дзяржава выдаткавала больш за 217 мільярдаў. Названыя сумы ветэраны атрымаюць праз органы, якія займаюцца выплатай пенсій. Аднаразовая дапамога ў сувязі з 70-годдзем Перамогі прадугледжана для 46,5 тысячы грамадзян.

Сёння ў Беларусі пражывае больш за 17 тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. З іх 12 тысяч — удзельнікі вайны.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

■ На слыху

# ПАДАТАК НА ДАРМАЕДСТВА ЎЗАКОНЯЦЬ ДЭКРЭТАМ

## Аднак плаціць яго будуць не ўсе беспрацоўныя

**Пра гэта ўчора паведаміў <u>начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Міхаіл РАСОЛЬКА</u>.**

### ХТО ЁСЦЬ ХТО

Спецыяліст адзначыў, што адпаведны праект дэкрэта аб стымуляванні занятасці грамадзян унесены ў Савет Міністраў Беларусі. Цяпер Саўмін ва ўстаноўленым парадку ўзгадняе праект дэкрэта з іншымі органамі, пасля чаго дакумент будзе ўнесены кіраўніку дзяржавы на разгляд.

Міхаіл Расолька патлумачыў, што ў праекце дэкрэта выразна прапісана, каму прыйдзецца заплаціць падатак на дармаедства, а каму не. Дакументам пакуль прапісана такая норма: плаціць такі падатак не павінны, напрыклад, бацькі малалетніх дзяцей і інваліды. Прадстаўнік міністэрства падкрэсліў, што дэкрэт накіраваны на тое, каб ліквідаваць практыку, калі працаздольныя грамадзяне, якія афіцыйна нідзе не працуюць, атрымліваюць ценявыя даходы, не плацяць падаткі і пры гэтым карыстаюцца ўсімі сацыяльнымі выгодамі, прадастаўленымі дзяржавай.

### РЭШТКІ ТАВАРАЎ ПРАДАДУЦЬ І БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ

**Намеснік міністра па падатках і зборах Васіль КАМЕНКА** закрануў праблемную сітуацыю, у якую трапілі асобныя індывідуальныя прадпрымальнікі. Прынятыя на ўзроўні кіраўніка дзяржавы рашэнні дазволяць сёння ім цывілізавана завяршыць продаж рэштак тавараў легпрама, увезеных без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё. Прынятыя рашэнні спадар Каменка ахарактарызаваў як абсалютна своечасовыя і правільныя. «А ў выніку гэта дае магчымасць годна і цывілізавана завяршыць працэс продажу рэштак тавараў, а падатковай службе — пракантраляваць законны рух атрыманых даходаў», — сказаў намеснік міністра.

У міністэрстве ёсць упэўненасць, што неабходныя папраўкі ў заканадаўства, якія спатрэбяцца для падаўжэння тэрмінаў і вызначэння парадку рэалізацыі рэштак тавараў прадпрымальнікамі, будуць прыняты ў кароткія тэрміны і ўжо на працягу тыдня будзе завершана распрацоўка адпаведнага прававога акта. Далей чыноўнік заўважыў, што 17 сакавіка прадпрымальнікам дазволілі прадаваць рэшткі тавараў на старых умовах да 1 студзеня наступнага года. Нагадаю, што згодна з нормамі ўказа ад 16 мая 2014 года №222 «Аб рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці і рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі» гэты тэрмін мінуў 1 сакавіка. Аднак, улічваючы скаргі прадпрымальнікаў, было прынята рашэнне распрацаваць нарматыўны прававы дакумент, які канчаткова ўрэгулюе гэтае пытанне.

Таму ўрад і бізнес-саюзы распрацавалі дапаўненні і змяненні ва ўказ №222. Прапануецца даць права індывідуальным прадпрымальнікам — плацельшчыкам адзінага падатку — рэалізоўваць тавары без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё, з адначасовым павелічэннем ставак падатку. Акрамя таго, прадугледжваецца ўстанаўленне для замежных грамадзян закрытага пераліку тавараў, што яны маюць права рэалізоўваць або прапаноўваць да продажу на рынках ці іншых месцах, устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Такія меры прапануюцца для таго, каб параўнаць у правах замежнікаў і сваіх грамадзян.

Новы дакумент павінен выкрасліць магчымасць стварэння няроўных канкурэнтных умоў паміж індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія гандлююць таварамі без дакументаў, айчыннымі вытворцамі, што выпускаюць аналагічную прадукцыю, і імпарцёрамі, якія выконваюць вызначаныя патрабаванні. Такім чынам для прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку — плануецца павялічыць падатковую нагрузку на 50%, вызначыць для іх просты і зразумелы парадак выплаты ПДВ у фіксаванай суме ў памеры 4-кратнай стаўкі адзінага падатку і выплаты адзінага падатку. Стаўка будзе павялічвацца ў тры этапы на працягу года. Пытанні няроўных канкурэнтных умоў з беларускімі вытворцамі — афіцыйнымі імпарцёрамі — прапануецца вырашыць эканамічнымі метадамі шляхам штогадовага паступовага павышэння падатковай нагрузкі. У наступным годзе прадпрымальнікам плануюць павялічыць ПДВ у фіксаванай суме да 5-кратнай стаўкі адзінага падатку, з 2017 года — да 6-кратнай стаўкі адзінага падатку.



Фота БЕЛТА.

### ДЛЯ ЎХІЛІСТАЎ ПАВЯЛІЧАЦЬ ШТРАФЫ

Васіль Каменка таксама паведаміў, што ў хуткім часе міністэрства збіраецца ініцыяваць павышэнне штрафаў за нявыплату падаткаў для суб'ектаў гаспадарання. Намеснік міністра падкрэсліў, што ў нас сума штрафных санкцый па такіх парушэннях невялікая. Сёння гэта ўсяго 20% ад нявыплачанай сумы падатку. Для параўнання: у Германіі штраф складае 300% па суме неаплачаных падаткаў. Цяпер падатковыя службы прапануюць павялічыць такія штрафныя санкцыі ў 5 разоў, каб давесці іх хаця б да 100% ад сумы ўтойвання.

Намеснік міністра нагадаў, што раней у Беларусі штраф таксама даходзіў да 300% ад сумы недаплаты. Потым, разлічваючы на тое, што суб'екты гаспадарання стануць больш дысцыплінаванымі ў плане выплаты падаткаў, санкцыі змякчылі. Акрамя таго, для парушальнікаў, якія выплацяць прад'яўленыя ім сумы да прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, штрафы былі зніжаны з 20% да 10%. Аднак практыка паказала, што маленькія штрафы не сталі стрымліваючым фактарам для парушальнікаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Знешнепалітычны вектар

## ПЕРАМОВЫ Ў НЬЮ-ЁРКУ

Трэці раўнд міжурадавых перамоў па падрыхтоўцы да пасяджэння Генеральнай Асамблеі ААН высокага ўзроўню 2015 года (Саміту ААН — 2015) будзе праходзіць у Нью-Ёрку з 23 па 27 сакавіка. Дэлегацыю нашай краіны ўзначаліць намеснік міністра замежных спраў Валянцін Рыбакоў. Пра гэта на брыфінгу паведаміў **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства.**

— Чакаецца, што дадзеная сустрэча стане важным этапам па выпрацоўцы і ўзгадненні фінальнага дакумента Саміту ААН — 2015, у якім будуць падведзены вынікі дасягнення мэтаў развіцця тысячагоддзя і вызначаны ўніверсальныя арыенціры на найбліжэйшыя 10-20 гадоў у дзейнасці міжнароднай супольнасці па забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця, — адзначыў прадстаўнік МЗС.

Дэлегацыя нашай краіны прыме ўдзел у Канферэнцыі кіраўнікоў абаронных ведамстваў па пытаннях правядзення аперацый ААН па падтрымцы міру, якая адбудзецца ў Нью-Ёрку 27 сакавіка.

Падчас візіту Валянціна Рыбакова ў Нью-Ёрк запланавана рабочая сустрэча з кіраўнікамі місій дзяржаў — членаў Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва. У яе рамках адбудзецца прэзентацыя кнігі беларускага гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь і мусульманскі свет».

— Дарэчы, гэта не першы праект Уладзіміра Ліхадзедава, які прэзентуецца з удзелам Міністэрства замежных спраў Беларусі, — заўважыў Дзмітрый Міронччык. — У мінулым годзе ў сценах нашага міністэрства адбылася выстава, прысвечаная Першай сусветнай вайне. Яна была сфарміравана з фондаў спадара Ліхадзедава.

## ТАВАРАЗВАРОТ НЕ ПАМЕНШЫЎСЯ

У Тбілісі ўчора завяршыліся беларуска-грузінскія кансультацыі паміж МЗС на ўзроўні намеснікаў міністраў замежных спраў. Дэлегацыю нашай краіны ўзначаліў першы намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Міхневіч, грузінскую — намеснік міністра замежных спраў Давід Джалаганія.

— Тавазварот Беларусі і Грузіі адносна невялікі — 64 мільёны долараў, — паведаміў Дзмітрый Міронччык, адказваючы на пытанне пра супрацоўніцтва дзвюх краін. Трэба адзначыць, што, нягледзячы на крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, прынамсі ў еўрапейскім рэгіёне, узровень беларуска-грузінскага тавараз вароту ў мінулым годзе не паменшыўся. Мы мяркуем, што ёсць патэнцыял нарошчвання ўзаемнага гандлю. У нашых інтарэсах таксама надаць двухбаковаму гандлю больш збалансаваны характар, бо на сёння імпарт з гэтай краіны перавышае беларускі экспарт туды.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне загадчыку сектара кадравай работы ўпраўлення прававой і кадравай работы міністэрства Лабовіч Алене Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ОАО «Витебсклес»

Учетный номер плательщика: **300029146.**
Вид экономической деятельности: **лесозаготовки.**
Организационно-правовая форма: **открытое акционерное общество.**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **210013, г. Витебск, ул. Ленинградская, 119А**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 15 426 | 19 633 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **15 426** | **19 633** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 13 229 | 9 335 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 1 620 | 1 675 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 4 618 | 6 007 |
| готовая продукция и товары | 214 | 6 991 | 1 653 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 285 | 807 |
| НДС по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3 299 | 3 059 |
| из стр. 250 по расчетам с бюджетом | 251 | 1 | 13 |
| из стр. 250 по социальному страхованию и обеспечению | 252 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 89 | 290 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 2 | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **16 904** | **13 491** |
| **БАЛАНС** | **300** | **32 330** | **33 124** |
| Справочно: стоимость имущества, переданного по договору безвозмездного пользования | 301 | 722 | 928 |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 385 | 4 385 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 135 | 135 |
| Добавочный капитал | 450 | 20 169 | 20 661 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (13 969) | (12 333) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **10 720** | **12 848** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 2 822 | 3 449 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **2 822** | **3 449** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 2 000 | 1 999 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 16 788 | 14 828 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 12 532 | 6 188 |
| по авансам полученным | 632 | 256 | 3 571 |
| по налогам и сборам | 633 | 305 | 320 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 553 | 596 |
| по оплате труда | 635 | 1 437 | 1 636 |
| по лизинговым платежам | 636 | 627 | 627 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 5 | 5 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 073 | 1 885 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **18 788** | **16 827** |
| **БАЛАНС** | **700** | **32 330** | **33 124** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

| Наименование показателя | Коды строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 74 255 | 78 646 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (62 232) | (73 042) |
| Валовая прибыль | 030 | 12 023 | 5 604 |
| Управленческие расходы | 040 | (3 518) | (3 738) |
| Расходы на реализацию | 050 | (8 243) | (11 306) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 262 | (9 440) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 5 285 | 8 288 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (6 490) | (9 846) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (943) | (10 998) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 177 | 90 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 145 | 38 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 32 | 52 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (321) | (154) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (321) | (154) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 59 | 82 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от перерасчета активов и обязательств | 121 | 59 | 82 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 100) | (1 465) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (910) | (1 215) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (69) | (67) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (121) | (183) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (1 185) | (1 447) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (2 128) | (12 445) |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (2 128) | (12 445) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | 867 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (2 128) | (11 578) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель М.Н. Диденок

Главный бухгалтер С.В. Карпушко

## ■ Прыёмная кампанія — 2015

# Рэктар БДУ выйдзе на анлайн-сувязь з абітурыентамі

**Фестываль факультэтаў пройдзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце 28 сакавіка. У гэты дзень з 10.00 да 16.00 вядучы ўніверсітэт краіны стане адкрытай пляцоўкай для дыялогу абітурыентаў і іх будучых выкладчыкаў.**

Аб структуры ВНУ, спецыяльнасцях і напрамках падрыхтоўкі, адукацыйных і навуковых дасягненнях факультэтаў школьнікі змогуць даведацца на шматлікіх прэзентацыйных мерапрыемствах. А пра асаблівасці прыёму і правілы паступлення ва ўніверсітэт раскажуць прадстаўнікі прыёмнай камісіі. Будзе арганізавана і індывідуальнае кансультаванне. Больш за тое, на сёлетнім Фестывалі факультэтаў будуць улічаны таксама інтарэсы абітурыентаў, якія пражываюць у аддаленых рэгіёнах Беларусі. Упершыню для іх будзе праведзена online-канферэнцыя з удзелам рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі. Пачатак у 13.00. Прамая трансляцыя мерапрыемства будзе весціся на афіцыйным сайце БДУ. Любы школьнік зможа папярэдне задаць пытанне, якое тычыцца прыёмнай кампаніі, у афіцыйнай групе БДУ ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» (раздзел «Абітурыент БДУ»).

Пра тое, якое разнастайнае і багатае на падзеі жыццё сучаснага ўніверсітэта, госці фестывалю даведаюцца з прэзентацый дзейнасці студэнцкіх грамадскіх арганізацый, псіхалагічнай службы і спартыўнага клуба БДУ. Для ўдзельнікаў універсітэцкага свята падрыхтаваны таксама забаўляльныя мерапрыемствы. Будучыя студэнты змогуць убачыць выступленні каманды КВЗ і творчых калектываў БДУ, праверыць свае сілы ў інтэлектуальных і інтэрактыўных конкурсах і віктарынах.

Свята для будучых абітурыентаў пройдзе ў сценах Ліцэя БДУ (вул. Ульянаўская, 8). Урачыстае адкрыццё з удзелам рэктара БДУ, акадэміка Сяргея Абламейкі запланавана на 11 гадзін.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## ■ Ёсць пытанне

# Сезон нарыхтоўкі бярозавіку пачаўся

### А купіць гараджаніну карысны прадукт па-ранейшаму няпроста


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**У Бярозаўскім лясніцтве Пружанскага ляггаса сезон нарыхтоўкі пачаўся тыдзень таму. Сама назва вёскі Бярозавічы сведчыць, што тут спакон веку добра растуць бярозы. Ды ляснічы Міхаіл Калодзіч лічыць сёлетнюю вясну не самай ураджайнай на сок. Для шчодрага сокаруху патрэбна вільгаць. А мінулай зімой снегу было — кот наплакаў. Вось і не набралі дрэвы вільгаці столькі, колькі бывае яе снежнай зімой. Ды і цяпер на Пружаншчыне кожную ноч падмарожвае не на градус-другі, а значна больш. Таму ноччу мяшкі фактычна стаяць пустыя, і толькі ранкам з першымі промнямі сонца пачынаецца актыўны рух соку.**

Хоць і не такімі тэмпамі, як хацелася б, але лясніцтва адгружае штодня тоны соку прадпрыемствам, з якімі мае дагавор, а таксама прадае гаючы напітак насельніцтву. Людзі прыязджаюць на дзялянку сваім транспартам і купляюць патрэбную колькасць прадукцыі па цане 1200 рублёў за літр.

У Пружанскім ляггасе дзевяць лясніцтваў, і ўсе прыступілі да нарыхтоўкі соку. Паводле слоў вядучага інжынера Брэсцкага лесагаспадарчага аб'яднання Уладзіміра ІЛЬЮКЕВІЧА, праблем з набыццём свежага бярозавіку для гараджан няма, хто хоча, той можа паехаць на дзялянку і нарыхтаваць яго. Арганізоўваць продаж у горадзе і клопатна, і нязручна, лічаць брэсцкія лесаводы.

Але многія гараджане не пагадзіліся б з такой думкай. Па-першае, паехаць і купіць у бліжэйшым ад абласнога цэнтра лясніцтве сёння немагчыма. Трэба, як мінімум, запісацца ў чаргу амаль за тыдзень. Тады табе прызначаць дзень і час. І яшчэ — далёка не ва ўсіх ёсць машыны. Грамадскі транспарт, як вядома, у лес не ходзіць.

У горадзе жыве нямала пенсіянераў, адзінокіх людзей, якія з задавальненнем купілі б сок, каб яго дзе-небудзь прадавалі. Бярозавік настойліва рэкамендуюць урачы пры такіх захворваннях, як мочакаменная хвароба, пры некаторых паталогіях нырак, страўніка. Напітак трэба ўжываць не раз, не два, а прымаць курсам хаця б на працягу 10 дзён і меняваць свежым. І нават калі паехаць і купіць адразу літраў сто, то праз два-тры дні бярозавік пачынае закісаць. Каб было дзе, чалавек хадзіў бы і купляў праз дзень свежы сок. Як, напрыклад, у Слоніме, дзе бярозавік прадаюць у двух пэўных месцах з 11 да 17 гадзін. Патэлефанавала дырэктару Слонімскага ляггаса Аляксею ВАЙЦЯХОВІЧУ з пытаннем, як ім удалося арганізаваць такую работу. Усе ж спасылаюцца на нейкія завоблачныя прэтэнзіі санітарных службаў. Аляксей Міхайлавіч сказаў, што і да іх былі адразу пытанні з боку Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Але ж праблема аказалася вырашальнай. Усе асноўныя ўказанні раённай санітары выканалі. І ўжо другі год прадаюць сок насельніцтву: пакупнікі вельмі задаволеныя, прадукцыя карыстаецца попытам.

Сёлета толькі лянівыя сайты альбо выданні не напісалі, які ажыятаж вакол соку стварылі СМІ ЗША і Вялікабрытаніі. Самыя рэйтынгавыя тэлевядучыя запрашаюць у студыі зорных артыстаў, і тыя расказваюць, як яны адмовіліся ад прывычнай какосавай вады і перайшлі на бярозавую. Самыя тыражныя брытанскія і амерыканскія газеты пішуць пра гаючыя ўласцівасці бярозавага соку і як вынік — кошт упакоўкі бярозавіку даходзіць у іх да 50 долараў.

У нас жа бярозавы сок любілі і ўжывалі з даўніх часоў. Побач з любым горадам растуць бярозы, ідзе нарыхтоўка гаючага напітку, а вось зрабіць яго даступным для шырокіх слаёў насельніцтва няма ахвочых. Калі нават у Слоніме чэргі выстройваюцца, то ў Брэсце пакупнікоў, трэба думаць, было б няк не менш. Уладзімір Ільюкевіч у размове з карэспандэнтам сказаў, што ніхто не скардзіцца на такое становішча. Дык няўжо трэба скардзіцца, званіць на «прамую лінію» губернатару, пісаць лісты ў выканкамы? І вось тады, калі б выйшла распараджэнне зверху, можа, нехта і пачаў бы варушыцца. А так каманды не было. План, вядома, лягчэй выконваць, працуючы з прадпрыемствамі. Каб не абцяжарваць сябе лішнім клопатам з гарадскім гандлем насельніцтву, заўсёды можна спаслацца на строгасць санітарных службаў, няхватку цыстэрнаў альбо яшчэ на што-небудзь.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

## ■ Падзея

# 30% СОНЦА

### Пік сонечнага зацьмення чакаецца сёння ў Мінску ў 13 гадзін 6 хвілін



**Самае вялікае сонечнае зацьменне за апошнія шаснаццаць гадоў можна будзе назіраць на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці з абсерваторыі пры Мінскім планетарыі. Дзень падзеі — 20 сакавіка. Тады жыхары сталіцы змогуць паглядзець у тэлескоп у парадку жывой чаргі з паўдня да дзвюх гадзін дня. Паслуга планетарыя платная: кошт дарослага квітка складае 22 тысячы, а дзіцячага — 15 тысяч рублёў.**

Спецыялісты адзначаюць, што ў нашай краіне можна ўбачыць зацьменне з пакрыццём сонечнага дыска каля 70%. Поўнае закрыццё зоркі можна будзе назіраць на поўначы Атлантычнага акіяна і ў Арктыцы. Максімальнае перакрыццё Сонца ў Мінску чакаецца ў 13:06 па мясцовым часе. Яно будзе доўжыцца ўсяго каля 2 хвілін 50 секунд.

Варта адзначыць, што апошняе падобнае зацьменне беларусы назіралі ў 1999 годзе. Таму, хто прапусціць гэтае відовішча, прыйдзецца чакаць яшчэ 18 гадоў — да 2033-га.

### СПАЧАТКУ ПРА БЯСПЕКУ

Да такой знакавай падзеі спецыялісты падрыхтавалі рэкамендацыі па назіранні сонечнага зацьмення. Эксперты нагадваюць, што наша дзённае свяціла настолькі яркі аб'ект, што пры позірку на яго можна сур'ёзна пашкодзіць зрок — ажно да часовай яго страты! Памылкова меркаваць, быццам пры частковым зацьменні, калі большая частка сонечнага дыска схавана Месяцам, святло Сонца не такое яркае. Агульнае паданне асветленасці, вядома, мае месца, але адкрытыя зоны зоркі менш яркімі ад гэтага не становяцца.

Таму першае правіла, якое тычыцца назірання сонца, гучыць так: нельга глядзець на яго без абароны вачэй спецыяльнымі цёмнымі акулярамі або святлафільтрамі. Тым больш гэта тычыцца назірання яго ў бінокль ці тэлескоп. На шчасце, ёсць некалькі простых спосабаў, каб зрабіць гэты працэс бяспечным.

### ЦЁМНЫЯ АКУЛЯРЫ

Для прамога назірання сонца звычайныя сонцаахоўныя акуляры не падыходзяць — яны прапускаюць занадта шмат святла. Затое выдатна падыдзе тое шкло, якое выкарыстоўваецца ў масцы зваршчыка, або сонечныя святлафільтры, што пастаўляюцца ў камплекце некаторых мадэляў тэлескопаў. Ахоўныя акуляры можна зрабіць і самастойна. Для гэтага трэба густа закапціць звычайнае шкло або выкарыстоўваць двайны пласт засветленай фотастужкі.

**Сяргей ПАЛІНІН**

■

## ■ Дарэчы

# І тэлескоп, і лекцыя — бясплатна

Station Паназіраць сёння за сонечным зацьменнем запрашае мінчан Белдзяржуніверсітэт. Тэлескоп абсерваторыі БДУ будзе выстаўлены насупраць будынка рэктара ва ўнутраным дворыку (вул. Бабруйская, 5а). Убачыць гэту рэдкую астранамічную з'яву змогуць усе ахвотныя бясплатна. Акрамя таго, супрацоўнікі абсерваторыі БДУ падрабязна раскажуць пра сонечныя зацьменні і даследаванні, прысвечаныя вывучэнню Сонца.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## ■ Май на ўвазе

# НА ДАРОГАХ — ЧАСОВЫЯ АБМЕЖАВАННІ

**З 20 сакавіка па 20 красавіка на рэспубліканскіх дарогах уводзяцца абмежаванні нагрузак у межах ад 6 да 9 тон на адзіночную вось.**

Аднак на асноўных маршрутах руху транзітнага транспарту і некаторых іншых дарогах яны ўводзіцца не будуць, паведамілі ў прэс-цэнтры Міністэрства транспарту і камунікацый. Апроч таго, часовыя абмежаванні не будуць распаўсюджвацца на транспартныя сродкі, якія перавозяць пасажыраў, жывую жывёлу, кветкі, грузы гуманітарнай дапамогі, бетонныя і асфальтабетонныя сумесі, дарожныя бітумы, небяспечныя і хуткапсавальныя грузы, збожжа, камбікорм і інш.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


Свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «Эльюсторг» с регистрационным номером 191415184, выданное 11.02.2013 г., считать недействительным в связи с утерей.

**Отчет Местного благотворительного Фонда детей-инвалидов с художественными способностями «Голубые берега» г. Могилева об использовании своего имущества за 2014 год.**

1. Количество учредителей Фонда — 3.
2. Стоимость имущества Фонда составляет — 18.000.0, в том числе имущество, переданное учредителями Фонда, составило: 5.000.0.
3. Поступления от проводимых в соответствии с уставом Фонда мероприятий составили: 8.500.0.
4. Поступления от частных юридических лиц — 34.000.0.
5. Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общеполезных целей, указанных в уставе: 36.000.0.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790175626.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения №106/8, площадью 17,74 м.кв.,**
**находящегося на первом этаже здания по адресу:**
**г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 22.04.2015 г. в 11.30 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Заявления на участие принимаются до 17.00 17.04.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником представляется: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка размером 52 777 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 АСБ «Беларусбанк», код 603, УНН 100650172, ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, **не позднее 17.04.2015 года.**

Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения № 428/1, площадью 15,8 м.кв.,**
**находящегося на четвертом этаже здания по адресу:**
**г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 22.04.2015 г. в 11.00 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Заявления на участие принимаются до 17.00 17.04.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником предоставляется:
- копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- копия платежного поручения о перечислении задатка размером 47 005 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 АСБ «Беларусбанк», код 603, УНН 100650172, ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, **не позднее 17.04.2015 года.**

Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения № 441, площадью 8,6 м.кв.,**
**находящегося на четвертом этаже здания по адресу:**
**г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 22.04.2015 г. в 10.30 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Заявления на участие принимаются до 17.00 17.04.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником предоставляется:
- копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- копия платежного поручения о перечислении задатка размером 22 585 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 АСБ «Беларусбанк», код 603, УНН 100650172, ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, **не позднее 17.04.2015 года.**

Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения №308-2, площадью 15,2 м.кв.,**
**находящегося на третьем этаже здания по адресу:**
**г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 22.04.2015г. в 10.00 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Заявления на участие принимаются до 17.00 17.04.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником предоставляется: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка размером 45 220 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 АСБ «Беларусбанк», код 603, УНН 100650172, ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, **не позднее 17.04.2015 года.**

Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.

# «НЕЛЬГА БЫЦЬ ЗЛЫМ...»

## ЛЯЧЭННЕ КІСЛАРОДАМ

У 21-м аддзяленні зараз знаходзіцца 50 пацыентаў. Дзесяць з іх — на платнай аснове (250 тысяч у дзень, за ананімнасць).

— Ёсць людзі, якія кладуцца сюды па некалькі разоў. Неабавязкова таму, што «зрываюцца». Чалавек можа папрасіцца ў стацыянар, каб замацаваць эфект ад тэрапіі, хоць сам у рэмісіі на працягу некалькіх гадоў, — тлумачыць **загадчык 21-га аддзялення Уладзімір ІВАНОЎ**, які распрацаваў унікальны тэрапеўтычны курс для хворых з залежнасцю.

Каб дапамагчы пацыентам пераадолець цягу да алкаголю ці наркотыкаў, прымяняецца комплекснае лячэнне. Медыкаменты, псіхатэрапія, тэрапеўтычная праграма «Каўчэг», 12 крокаў ананімных алкаголікаў, спецыяльныя фільмы і літаратура... У цэнтры фарміруюць у хворых установку на цвярозасць і навучаюць тэхналогіям падтрымання цвярозага ладу жыцця ва ўмовах штодзённай рэальнасці. Курс рэабілітацыі ў аддзяленні звычайна доўжыцца тры тыдні. Далейшую дапамогу можна атрымаць у грамадскім аб'яднанні «Абуджэнне», дзе ўвечары працуюць бясплатныя псіхалагічныя групы не толькі для алкаголікаў і наркаманаў, але і для іх родных. Паводле слоў Уладзіміра Уладзіміравіча, пазабальнічная частка рэабілітацыйнай праграмы значна павышае эфектыўнасць тэрапіі.

Само аддзяленне хутчэй нагадвае санаторый, чым бальніцу. Хворыя наведваюць басейн, спартыўны зал, ходзяць на фізіяпрацэдуры. Ад залежнасцяў тут лечаць... кіслародам. Сеансы такой тэрапіі праводзяцца ў баракамерах (яны нагадваюць батыскаф), куды кісларод паступае пад высокім ціскам. Гэта павялічвае ўзровень клеткавага дыхання ў мозгу, органах і тканках.



Пры лячэнні пацыентаў з залежнасцямі шмат увагі надаецца менавіта псіхалагічнаму боку тэрапіі.

## «НА ЭЙФАРЫІ НЕ П'Ю»

Ідзём знаёміцца з пацыентамі. Для некаторых з іх алкагалізм — справа сямейная. 31-гадовая Жэня прыехала сюды разам з мужам. Пяты раз. Двойчы жанчына клалася без зрываў: паспявала злавіць той момант, калі адчувала, што маральна становіцца горш. Цяпер не стрымалася. Муж набраў крэдытаў, запіў — Жэня пару дзён пазлавалася і запіла ўслед за ім. Дваіх маленькіх дзяцей пакуль даглядае бабуля.

— Гадоў 7 таму я зразумела, што ў мяне праблемы з алкаголем, — расказвае жанчына. — Не бывае такога, каб я піла толькі дзень. Запоі зацягваліся мінімум на паўтыдня. Самой выйсці з гэтай сітуацыі складана. Цяга прысутнічае пастаянна, кожныя паўгода — вясной і восенню — у мяне абвастрэнні. Тут добрае месца. Шмат груп (сеансы з псіхолагамі, сходы ананімных алкаголікаў), таму цэлы дзень занятая. Ведаеце, якія першыя рэкамендацыі псіхатэрапеўтаў? Нельга быць злым, галодным і адзінокім. Я, напрыклад, на эйфарыі ніколі не п'ю.

Дарэчы, да сустрэч з псіхолагамі і да розных псіхатэхнік многія пацыенты спачатку ставяцца скептычна. Але пасля прызнаюцца, што менавіта такая тэрапія аказваецца найбольш дзейснай.

Гену, які ў завязцы больш за год, — 30. У Навінкі звярнуўся, калі ўбачыў, як спецыялісты аддзялення дапамаглі яго цётцы і бацьку.

— Як ты тут апынуўся? Не за адзін жа дзень людзі співаюцца, — пытаемся ў маладога алкаголіка.

— Вядома, не. Я 16 гадоў да гэтага ішоў. Думаў, асяроддзе вінавата. Але кампанію кожны выбірае сабе сам.

— Цяпер не п'еш нават па святах?

— А навошта ўжываць, калі і так сябе добра адчуваеш? Выпіць можна, толькі чым гэта скончыцца потым? Ёсць людзі, якія і па 7, і па 8 разоў кладуцца сюды. А сэнс? Жыць у гэтым аддзяленні?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## «СТАЛА СТРАШНА, ШТО СТРАЧУ РОЗУМ»

Сярод наркаманаў, якія лечацца ў 21-м аддзяленні, хапае тых, хто «падсеў» на спайс. І ўсе — юнакі.

— Уласцівыя маладым людзям інфантылізм, эмацыянальна-валявая няўстойлівасць, нізкая супраціўляльнасць націску рэферэнтнай групы спрыяюць хуткаму фарміраванню сіндрому залежнасці ад спайсаў, — тлумачыць Уладзімір Уладзіміравіч. — Гэтыя сінтэтычныя наркотыкі выклікаюць залежнасць на псіхалагічным і фізічным узроўні ўжо праз некалькі тыдняў ад пачатку ўжывання. А цяжкія медыцынскія наступствы — зніжэнне памяці, інтэлекту, развіццё шызафрэнападобных псіхозаў — складана паддаюцца лячэнню.



**Гена: «Мяжа паміж «выпіваю крыху па вечарах» і алкагалізмам настолькі тонкая, што не заўважыш, як пераступіш».**

У адной з палат знаходзіцца хлопец Ілья. Спайс ён паспрабаваў у восьмым класе. У «паслужным спісе» юнака псіхіятрычнае аддзяленне ў Навінках, дзіцячая псіхіятрыя адной з мінскіх бальніц, суіцыднае аддзяленне. Сюды Ілья прыехаў некалькі дзён таму, і заўважна было, што абыходзіцца без наркотыкаў яму пакуль няпроста: увесь час, што мы размаўлялі, хлопец нервова заломваў сабе пальцы.

— За пяць дзён я так павялічыў дозу, як раней набіваў за год, — расказвае падлетак. — Маці пачала пілаваць: едзь у бальніцу або сыходзь з дому. Самому стала страшна, што страчу розум. Мае сябры ўжо дагуляліся. Хтосьці сядзіць у турме, іншыя — на тым свеце. Спайс вельмі лёгка дастаць. Адкуль у школьнікаў грошы на наркотыкі? Падманваюць бацькоў, быццам ідуць у кіно ці ў трэнажорку, і просяць на гэта некалькі сотняў, крадуць, становяцца пасярэднікамі.

У калідоры мы разгаварыліся з Максімам. Невысокі, з выгляду нармальны хлопец — думала спачатку, прыйшоў адведаць кагосьці са знаёмых — аказаўся наркаманам з 12-гадовым стажам. За мінулы год юнак пахаваў шасцярых залежных прыяцеляў. Выпісвацца з аддзялення пацыент не спяшаецца: пакуль не ўяўляе, як стрымаць сябе «на волі».

— Разумееш, залежны чалавек пастаянна думае пра дозу. Я не магу атрымліваць асалоду ад таго, што проста шпацырую па вуліцы ў добрае надвор'е і ем марозіва. Без дозы я нават з дзяўчынай перапаць не магу, — прызнаецца Максім.

Хлопец расказаў, што некалі працаваў намеснікам начальніка СТА, зарабляў каля дзвюх тысяч долараў і важыў на 20 кілаграмаў больш. За свае 24 гады Максім ні разу не быў у тэатры, але, як толькі пачне здаровы лад жыцця (калі гэта можна так назваць), збіраецца наведаць спектакль ці мастацкую выставу.

— І вы ўсяму паверылі? — аклікае нас з фотакарам і дзяўчынай-інтэрнам **псіхолаг Іна КАЛАСОЎСКАЯ**. — Наркаманы любяць хлусіць. Хоць нашы пацыенты стараюцца быць шчырымі і сапраўды хочуць вярнуцца да нармальнага жыцця.

## ДАСТУПНЫЯ ГУЛЬНЯВЫЯ АЎТАМАТЫ І ПІЎНЫ АЛКАГАЛІЗМ

У дзень нашага візіту гульняманаў у аддзяленні не было. Такія пацыенты ўвогуле апошнім часам радзей паступаюць. Не таму, што залежных ад азарту стала меней. Проста большасць гульняманаў у дадатак хварэюць на алкагалізм ці наркаманію, і гэтымі праблемамі трэба займацца найперш. Узгадваюць пацыента, які не заходзіць у казіно ўжо 18 гадоў: прайграў вялікую суму і вырашыў больш не рабіць ставак. Хоць залежнасць засталася і адбілася на асобе. У мужчыны алексітымія: у 40 гадоў ён не можа перадаваць свае эмоцыі.

Іна Сяргееўна мяркуе, што ў распаўсюджванні залежнасці ад азарту трэба вінаваціць гульнявыя аўтаматы. «У казіно не ўсе пойдуць: для гэтага трэба мець мінімум 100 долараў. Моладзь і школьнікі прасаджваюць грошы ў аўтаматах. Гэтыя апараты неабходна было б схаваць у падвалы, як гэта робіцца ў еўрапейскіх краінах».

Пакуль мы размаўлялі з псіхолагам, Уладзімір Уладзіміравіч прывёў да яе ў кабінет чарговую, зусім маладзенькую, пацыентку. Дзяўчына трапіла сюды з-за... піва.

**Да сустрэч з псіхолагамі і да розных псіхатэхнік многія пацыенты спачатку ставяцца скептычна. Але пасля прызнаюцца, што менавіта такая тэрапія аказваецца найбольш дзейснай.**

— Хоць большасць і не хоча верыць, піўны алкагалізм існуе. Вось перад вамі прыклад. А ўсё таму, што ў 90-я, калі піва стала набываць папулярнасць, яно не пазіцыянавалася як алкагольны напой. Цяпер складана пераканаць людзей, што бутэлька «цёмнага» кожны дзень — гэта ненармальна, — кажа нарколаг.

Спрыяе тут, безумоўна, і даступнасць спіртнога. І ўсё ж... Чалавечы фактар ніхто не адмяняў. Мы жывём не ў інфармацыйным вакууме, і наступствы алкагольнай ці наркатычнай залежнасці добра вядомыя. Навошта перакладваць віну за сапсаванае жыццё на прадаўцоў ці кампанію? У кожнага свая галава на плячах.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Некаторым пацыентам стрымліваць цягу дапамагае малітва.

■ Неасабісты суб'ектыў



# ГАРЫ ЯНО ГАРАМ?

## Жудасныя прыкметы сёлетняй вясны

ГЭТЫ сонечны бясснежны сакавік са сваімі сухавеямі, якія падсцерагаюць у завулках і на скрыжаваннях, — як закляты. Гараць жывыя людзі. Я, шчыра кажучы, з раніцы ўжо баюся адкрываць стужку навін: абавязкова выскачыць загаловак кшталту «Пры спальванні сухой расліннасці загінуў (варыянт: моцна абгарэў) чалавек». І так кожны дзень, прынамсі, апошні тыдзень. Геаграфія — уся краіна: Ветка, Касцюковічы, Смаргонь. Сёння, напрыклад, палічылі оптам: Міністэрства па надзвычайных сітуацыях лаканічна паведаміла, што за апошнія суткі з-за ўсё тых жа рукатворных пажараў загінулі пяць чалавек. Усяго з пачатку года жудасную смерць самі сабе такім вось чынам «арганізавалі» адзінаццаць няшчасных. Пры гэтым абгарэла амаль тысяча трыста гектараў зямлі, полымя злізала восем жылых дамоў і больш за сорак гаспадарчых пабудоў. Колькі ў ненажэрнай стыхіі згінула дабра, дакументаў, фотаздымкаў, свойскай жыўнасці — статыстыка ратавальнікаў замоўчвае.

Такое ўражанне, што разам з агнём, які жвава падганяе вясёлы вясновы ветрык, па нашай зямлі коціцца эпідэмія. Звычайнай чалавечай безадказнасці і, выбачайце, дурасці. Сюжэты падобных здарэнняў амаль аднолькавыя, варыянтаў — абмежаваная колькасць. У канцы лета за плотам, а то і на ўчастку вырас высокі бур'ян. Пакуль ён зелянеў-каласіўся — вочы надта за яго не чапляліся, а касіць не хацелася або не было каму. Пасля зімы той самы бур'ян стаіць пачварнай рудой сцяной і вока ўжо зусім не радуе. А парадак наводзіць трэба: і перад людзьмі сорамна, і штраф можна атрымаць. Касіць ці вырываць — гэта ж колькі работы! Чыркнуў запалкай — і ўся справа. Пішуць і гавораць, што гэта небяспечна? Дык гэта, пэўна, у тых, хто пажар зрабіў, рукі не з таго месца растуць. А ў мяне ж усё пад кантролем, я ж, калі што, прыпільную і тут жа хуценька агонь патушу...

ТАК, пэўна, думала і бабуля з Віцебшчыны, якая, і праўда, агню на сваім участку рады дала, але пры гэтым атрымала такія апёкі, што сканала ў бальніцы. І 41-гадовы дзяцюк з Гомельшчыны, які, «паддаўшы», раптам вырашыў за некалькі хвілін ачысціць двор і, зваліўшыся ў палаючую траву, ужо не падняўся. І вясковец з Магілёўшчыны, які, убачыўшы, што полымя з падпаленай ім травы перакінулася на хату, кінуўся ратаваць нямоглую жонку (а потым — нажытае дабро) і ў чарговы заход з той хаты не вярнуўся...

Трагедыі, жахлівыя не толькі з-за пакутніцкай смерці, якую гэтыя людзі прынялі літаральна па сваёй добрай волі. Яшчэ больш страшныя яны з-за сваёй бессэнсоўнасці, бязглуздасці, калі хочаце. Гэта менавіта той выпадак, калі людзям настойліва гавораць адно (прычым у розных варыяцыях: палохаюць страшнымі наступствамі і значнымі штрафамі, спрабуюць дастукацца да сумлення і міласэрнасці, паказваючы, колькі жывога гіне ў агні). А людзі не менш настойліва робяць з дакладнасцю наадварот. Гуляюць з агнём у самым што ні ёсць прамым сэнсе. Паляць, паляць (бы і праўда апантаныя нейкай адной вар'яцкай заразай) — ратавальнікі штодня фіксуюць па 50-60 выпадкаў узгарання ў кожнай вобласці.

МНЕ давялося бачыць, як ідзе лавіна агню па сухой траве. Тады ўся вёска, затаіўшы дыханне, назірала, як з-пад Галабурдаў на ўсю шырыню вялізнага поля ідзе на нас яркая рыса, за якой — суцэльнае чорнае. Да вёскі было яшчэ кіламетры тры, наперадзе ў навалы была шыракаватая рачулка, і таму назіралі за ўсім спачатку хутчэй з цікавасцю, ашаломленыя сілай стыхіі. Але калі майскі вецер лёгенька так перакінуў агонь на другі бераг рэчачкі і паміж полымем і вёскай не засталося ніякай перашкоды, стала рэальна страшна. Кінуліся выклікаць пажарнікаў, тыя прымчалі хутка, але машына засела ў непрасохлай пасля зімы зямлі. І тады ратаваць свае дамы ад навалы выйшлі ўсе — і старыя, і малыя. Агонь патушылі ўжо амаль каля першых платоў. Таго, хто дзесьці далёка ад вёскі падпаліў сухастой, кабеты клялі апошнімі словамі.

З таго часу мінула ўжо амаль дваццаць гадоў, а адчуванне страху — рэальнага, асабістага — засталося. Можа, таму ў нас вогнішчы на ўчастках — з'ява вельмі рэдкая, і то ў ціхае надвор'е. А ўжо калі хто з новых дачнікаў возьмецца падпальваць смецце каля хаты — хай ад мясцовых бабуль літасці не просіць: прымусяць і патушыць, і вадой заліць, каб нават не дымела. Мае землякі добра засвоілі дадзены стыхіяй урок. Як, спадзяюся, засвояць і тыя, чые суседзі сёлета зажыва згарэлі ва ўласнаручна разведзеным агні...

Але чаму, каб наш чалавек штосьці зразумеў, урокі павінны быць такімі страшнымі і датычыцца кожнага асабіста?

Я ВОСЬ яшчэ пра што думаю. Нярэдка даводзіцца чуць, што людзі, падпальваючы сухастой, наводзяць парадак «дзедаўскім спосабам». Вось тут хочацца паспрачацца: хоць спосаб і варварскі, але зусім не «дзедаўскі». Дзяды і прадзеды так не рабілі. Прынамсі, нідзе не зафіксавана, каб з-за таго, што нехта чысціў участак агнём, згарэлі хаты ці загінулі людзі. Зямлю продкі паважалі, атаясамлівалі яе з жывой істотай, з маці-карміцелькай. Яе не запускалі бур'янам, не «будзілі» да Радаўніцы, ёй асцерагаліся лішні раз зрабіць балюча.

А што цяпер? Гары яны гарам, тыя дзедаўскія прымхі ды сучасныя забароны?

Вось яно і гарыць...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■

## Уладзімір БОГДАН:

TV@R

# «МАГУ КАРМІЦЬ ВАЎКОЎ І КІРАВАЦЬ ПАРАВОЗАМ»



**Захапленне справай, якая стала прафесіяй, у яго пачалося ў школе, калі з сябрам спрабаваў рабіць першыя запісы радыё-шоу на магнітафоне. Наогул усё магло скласціся так, што Уладзімір працягнуў бы сямейную традыцыю і стаў ваенным, як бацька і дзед. Аднак мудрыя бацькі далі свабоду выбару свайму сыну. У выніку Уладзімір выбраў радыё і тэлебачанне. Яго вобраз часцей асацыюецца з сур'ёзным мужчынам, які любіць машыны, матацыклы і хуткасць... Мы сустрэліся з вядучым праграм «Беларуская часінка», «Ваша лато» і «Я хачу гэта ўбачыць» Уладзімірам Богданам, каб высветліць, чым ён здзіўляе сам сябе, як ратуецца ад праблем і чаго яму не хапае для поўнага шчасця.**

### ЗАДАВАЛЬНЕННЕ НЕ КУПІШ

***— Праекты, у якіх вы на сёння задзейнічаны, распланавыя. Вы ў пошуку свайго фармату ці проста любіце эксперыментаваць?***

— У пошуку я знаходжуся сёння ў іншай сферы. А кожны з праектаў, у якіх працую, для мяне па-свойму дарагі. Праграма «Я хачу гэта ўбачыць» — пра падарожжы, і менавіта яна найбольш дазваляе мне раскрыцца як чалавеку і асобе, бо там я такі, які ў жыцці. Многія нават прывыклі, напрыклад, да таго, што мяне часцей можна сустрэць у майцы з чарапамі, чым у гальштуку... Праект «Беларуская часінка» — першая праграма, у якую я трапіў на працу, прыйшоўшы на тэлебачанне. Я не быў асабліва адораным чалавекам, але прайшоў кастынг і трапіў у шэраг вядучых праграмы. Вельмі яе люблю. А «Ваша лато» — праграма, цікавая з пункту гледжання майстэрства вядучага. Там усё трымаецца ў прамым эфіры толькі на табе. Калі раптам нейкія тэхнічныя непаладкі, заядае лататрон ці электрычнасць знікла — ты павінен запоўніць любую паўзу. Твая задача бачыць у экстрэмальнай сітуацыі выклік, які ты здольны пераадолець. Кожны прамы эфір непрадказальны. Кожны тур мае свае асаблівасці, і трэба быць гатовым да любых сюрпрызаў. Калі вядучы ўдала спраўляецца з гэтай праграмай, то як прафесіянал ён нечага варты. А вось праект «Я хачу гэта ўбачыць» — зусім іншая гісторыя. Тут патрабуецца лаканічнасць ад вядучага, але каб было сказана галоўнае. І гэта аказалася складаным, хоць і думаў, што ўжо ўмею ўсё. Дагэтуль змагаюся з сабой, калі даводзіцца рабіць некалькі дубляў падчас запісу падводак. Праграма «Я хачу гэта ўбачыць» — гэта яшчэ і мой прадзюсарскі досвед.

З'яўляюцца і будуць з'яўляцца новыя праекты майго аўтарства. Вось літаральна нядаўна стартаваў на тэлеканале «Беларусь 2» праект «Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна». Хочацца рабіць разнапланавыя праграмы, і ідэй для іх хапае.

***— У працы для вас важней творча развівацца ці зарабляць?***

— Абодва аспекты маюць значэнне. У мяне сям'я, двое дзяцей, якіх трэба ўтрымліваць. Безумоўна, здараюцца моманты, калі ты разумееш, што твае сябры могуць зарабляць больш, маючы нейкі бізнес. Аднак тут важна ўлічваць, наколькі шчаслівым і задаволеным ты вяртаешся з працы кожны дзень. І гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі займаешся тым, што па душы. Я не кар'ерыст з пункту гледжання грошай. Так, заўсёды было цікава паспрабаваць сябе ў ролі дырэктара, генеральнага прадзюсара, але потым, паспрабаваўшы, зразумеў — абсалютна не маё. Не таму, што не магу, а проста ў нейкі момант становіцца сумна. Для мяне вельмі важная наяўнасць творчага складніку ва ўсім, чым бы я ні займаўся. Думаю, калі ты атрымліваеш задавальненне ад сваёй справы, то і грошы з часам прыйдуць. Я за залатую сярэдзіну паміж заробкам і творчасцю. Не падзяляю пазіцыі, калі нехта засяроджваецца толькі на творчасці і кажа: дайце мне тварыць і не чапайце. Я, напрыклад, хачу ездзіць на добрым аўтамабілі, катацца на матацыкле. Ёсць шмат іншых рэчаў, якія патрабуюць грошай. Таму гаварыць аб працы дзеля грошай дрэнна, але і без іх ніяк. Тым больш калі разглядаць сітуацыю з мужчынскага пункту гледжання, дзе самой прыродай у нас закладзены інстынкт здабытчыка...

***— Улічваючы ваш шматгадовы вопыт працы ў прамым эфіры на радыё і тэлебачанні, мабыць, хвалявання ці захаплення ўжо менш?***

— Хваляванне не знікае ніколі. Ведаеце, часта кажуць, быццам, калі знікае хваляванне, то трэба сыходзіць з тэлебачання. Я з такім поглядам не згодны, бо лічу: калі перастаеш хвалявацца — ты проста дасягнуў ужо пэўнага ўзроўню. Але бывае па-рознаму. Напрыклад, я не хвалююся падчас здымак праекта «Я хачу гэта ўбачыць», хоць бываюць моманты, калі адчуваю сябе сціснутым. Усё яшчэ ніяк не прывыкну да сітуацыі, калі побач шмат людзей і яны нічога не падазраюць, а ты раптам пачынаеш нешта расказваць... На «Беларускай часінцы» не хвалююся зусім, а вось «Ваша лато» не абыходзіцца без такіх эмоцый, асабліва ў апошнія секунды перад эфірам. Галоўнае, што я атрымліваю ад сваёй працы задавальненне. Вось калі гэтага няма, то дакладна можна сыходзіць з кадра.

### НЕВЕРАГОДНЫЯ ПРЫГОДЫ — ЛЕПШЫ АДПАЧЫНАК

***— Як выбіраеце маршруты вандровак і што застаецца за кадрам праекта «Я хачу гэта ўбачыць»?***

— З пытаннем, куды паехаць, усё вельмі проста — адкрыў карту і выбірай. Сам праект наогул пачаўся з таго, калі я аднойчы падчас удзелу ў мотапрабегу праехаўся па Беларусі і зразумеў, што ў нашай краіне вельмі шмат месцін, якіх мы не ведаем. Мне ёсць з чым параўноўваць, бо ўдалося не раз за мяжой адпачываць. Гаворачы аб праекце, маршрут там заўсёды выбіраюць рэдактары, і я з імі нават не спрачаюся. Пішацца пэўны сцэнарый, аднак у працэсэ ён перакройваецца больш чым на палову. Бо ў дарозе мы знаходзім нешта цікавейшае, чым ёсць у інтэрнэце. І што немалаважна, у нас праграма не пра гісторыю і не пра геаграфію, а пра людзей, праз вобразы якіх мы расказваем пра ўсё.

> **«Калі раптам нейкія тэхнічныя непаладкі, заядае лататрон ці электрычнасць знікла — ты павінен запоўніць любую паўзу. Твая задача бачыць у экстрэмальнай сітуацыі выклік, які ты здольны пераадолець».**

Шмат застаецца за кадрам. Можна было б яшчэ многія моманты ўключаць у праграму, калі павялічыць яе хронаметраж. Бывае, мы едзем у камандзіроўкі з боязю не сабраць матэрыял, але ўдаецца набраць яго нават больш. Плюс не ўваходзяць у выпускі многія гумарыстычныя моманты, якія трапляюць у кадр выпадкова. Тут важная работа каманды, якую, дарэчы, пэўны час даваўся фарміраваць, і цяпер я працую з тымі людзьмі, за якасць працы якіх магу смела паручыцца. А ад гледачоў праграмы «Я хачу гэта ўбачыць» я чую словы ўдзячнасці і водгукі пра тое, што ўжо нехта скарыстаўся запрапанаванымі намі маршрутамі ў сваіх вандроўках.

***— Асабістыя адкрыцці прысутнічаюць?***

— Праграма дае мне магчымасць спрабаваць многія рэчы. І я здзіўляюся самому сабе, калі магу і паравозам кіраваць, і ваўкоў пакарміць. Адсутнічае ўсяляі страх, які, можа, і не быў бы лішнім у некаторых сітуацыях. Вылучаць нешта я не стаў бы, бо ў кожным выпуску адбываецца штосьці неверагоднае, і я назіраю за ўсім як дзіця з шырока расплюшчанымі вачыма. Варта паглядзець праграму, каб знайсці свае іскрынкі ў кожнай з іх. Нават зборы ў дарогу, самі пераезды з месца на месца мне вельмі падабаюцца, таму што дазваляюць адключыцца ад паўсядзённай мітусні.

***— А наогул удаецца знаходзіць час для паўнавартаснага адпачынку?***

— Лепшы адпачынак для мяне — гэта вандроўкі, прычым пажадана за мяжу, але і ў нас ёсць добры выбар. Часу, вядома, не хапае. З іншага боку, калі я сур'ёзны, прымаю адказныя рашэнні на працы, то маю патрэбу ў вызваленні энергіі. Мне трэба часам пабыць дзіцем, што я магу дазволіць сабе ў коле сваёй сям'і і вельмі блізкіх сяброў.

### КАШТОЎНАСЦЬ САПРАЎДНАГА ПОСПЕХУ

***— Жонка ў вас таксама творчая асоба. Лёгка ўжывацца двум такім людзям у адным доме?***

— Тут ёсць свае асаблівасці. З аднаго боку, тое, што мы людзі творчыя — гэта свята для нашых дзяцей і блізкіх, калі мы збіраемся ўсе разам. Але, прыадкрыю заслону таямніцы, не заўсёды лёгка ўжывацца дзвюм творчым асобам, калі разглядаць сітуацыю з пазіцыі паспяховасці. Бывае складана пераадолець сітуацыю, дзе адзін з вас дабіваецца большага, а другі адчувае канкурэнцыю ў гэтым. Важна ўмець такі момант канкурэнцыі, магчыма, нейкай зайздрасці перавесці ў радасць за блізкага чалавека. Мы такое праходзілі.

***— Неяк вы сказалі, што чалавек без сям'і — нібы пустая пасудзіна. Калі прыйшлі да такой высновы?***

— Калі сказаў бы, што такая пазіцыя была ў мяне з юнацтва, то пакрывіў бы душой. У мяне рана з'явіліся дзеці, сям'я. І звычайна сем'і, дзе усё так складваецца, не заўсёды застаюцца разам. У нас атрымалася, і цяпер і нам добра, бо маладыя яшчэ, і дзецям, якія ўжо падраслі. На маю думку, да высноў пра важнасць сям'і кожны мужчына прыходзіць з вопытам і ў свой час. Я нават не магу сказаць, быццам бачыў гэта на чыімсьці прыкладзе. Мне ўсё жыццё бацькі вучылі рабіць высновы з чужых памылак, але мне такая тактыка не падыходзіць. Пакуль сам нешта не адчуеш і не пройдзеш, то не зразумееш важнасць і каштоўнасць сям'і. Сёння, калі ў маім жыцці ёсць мае дзеці, жонка, цеплыня іх позіркаў, дом, то я разумею, дзе магу шукаць падтрымку і паратунак ад любых праблем. А яны, паверце, былі, і дастаткова складаныя. Няхай у цябе няма ні капейкі і жыццё ідзе так і сяк, але ты прыходзіш дадому, і там цябе ратуе падтрымка блізкіх...

***— Вам даводзілася ў жыцці прайграваць і губляць?***

— Так, але рэдка. Я вельмі настойлівы і дастаткова цярплівы. Калі імкнуся нечага дасягнуць, то ніколі не кіну распачатай справы. Няхай і праз год, але дайду да мэты. Аналізуючы некаторыя моманты ў працы і ў асабістым жыцці, разумею, што ўсё магло скласціся інакш. Упэўнены, калі гадамі працаваць і мець цярпенне, то магчыма дасягнуць жаданага. Для параўнання, я ў свой час прыйшоў на радыё, і галоўнае маё памкненне было ў тым, каб даказаць сабе і іншым, што я магу. А цяпер многіх маладых людзей цікавіць перш за ўсё, колькі ім заплацяць. На маю думку, людзі не дасягнуць нічога з такім падыходам, бо ўсё гатовае і адразу не атрымаеш.

***— Пра заваяванне нейкіх вышынь для сябе яшчэ задумваецеся?***

— Заваяванне вяршынь — пытанне ўжо не для мяне. Я маю пэўны жыццёвы вопыт і не хацеў бы нічога мяняць кардынальна. У працы я раблю ўсё, каб дасягнуць таго ўзроўню, якім буду задаволены. Хачу быць добрым вядучым і прадзюсарам, бо ў гэтым я знайшоў сябе. У маладосці было жаданне зрабіць кар'еру, а цяпер прыйшло разуменне, што вось пабудую дом недалёка ад горада і буду жыць там, прымаючы гасцей. Вось у чым мая вяршыня шчасця.



**Алена ДРАПКО.**




# Абібок з гарэзай б'юць тылылы

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» выходзіць гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Нава́ла** — нашэсце ворагаў. «Сякера ваеннай навалы», — пісаў Анатоль Вярцінскі ў «Рэквіеме па кожным чацвёртым».

**Знічка** — «зорка», якая, падаючы, згарае, знікае ў небе.

«Часта згаралі знічкі тады. Быў небасхіл чорны» — зноў жа з твора Анатоля Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым».

**Шчырава́ць** — дбайна, старанна рабіць што-небудзь.

**Пра́гнуць** — моцна жадаць.

**Абібо́к** — гультай, лайдак, лежабок.

**Гарэ́за** — весялун, непаседа, жэўжык. «Гарэзай Груню жартаўліва празвалі хлопцы за гуллівасць», — піша Мікола Аўрамчык.

**Біць тылылы** — займацца пустымі справамі, нічога не рабіць, гультайнічаць. Беларусы яшчэ скажуць: біць лынды, біць бібікі. У некаторых беларускіх гаворках сустракаецца слова «тылілікаць», гэта значыць — утварыць адпаведныя гукі пры дапамозе языка. Рускі аналаг — «отлёживать бока», «балду гонять», «бить баклуши».

**У чорта на рагах** — вельмі далёка, у аддаленым месцы. Па-беларуску будзе таксама — віру на калу, за светам. Па-руску «у чёрта на куличках», «за десятой горой».

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ■ Слухай сваё!

# НЕФАРМАЛЬНА. ДЛЯ СЯБРОЎ

### Уладзімір Пугач дасць першы сольны канцэрт

Упершыню ў кар'еры выступіць сольна — такім чынам лідар гурта «J:морс» вырашыў адзначыць свой дзень нараджэння. Эксклюзіўны канцэрт адбудзецца 18 красавіка ў адной са сталічных кавярняў.

«Я вельмі люблю іграць канцэрты, незалежна ад іх маштабу. Оўпэн-эйры, «лядовікі», маленькія залы, лясныя фестывалі, дамы культуры, клубы — у кожнай пляцоўкі ёсць сваё незвычайнае харастово і, калі хочаце, непаўторны «смак», — сцвярджае Уладзімір Пугач. — І я вельмі рады, што гэта ўсё ёсць у маім жыцці. Але часам хочацца чагосьці ўтульнага і хатняга — ведаеце, стаць там на табурэцік і расказаць вершык або паспяваць песні ў кампаніі сяброў, чаго я не рабіў ужо гадоў дзесяць».

Навярстаць упушчанае артыст збіраецца якраз падчас выступлення «Акустыка. Канцэрт для сяброў». У праграме заяўлены аўтарскія версіі вядомых хітоў гурта, а таксама нявыдадзеныя кампазіцыі і каверы Уладзіміра Пугача на песні яго любімых артыстаў, а атмасферу абяцаюць утульную і нефармальную. Квіткі на канцэрт каштуюць ад 300 да 400 тысяч рублёў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

# ПАНЯДЗЕЛАК, 23 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 1.20** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.40, 20.00 Серыял «Гетэры маёра Сакалова».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.50 Меладрама «Танцуй...».**
**13.50, 15.55 Меладрама «Самая прыгожая». 1—4-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**22.45 Драма «Экіпаж».**
**2.00** Дзень спорту.
**8.00, 18.50, 23.25** Калейдаскоп.
**8.10, 17.00** «Дыя@блог P.S.».
**8.35 «Пісьмо незнаёмкі». Меладрама.**
**10.10 «Гора баяцца — шчасця не бачыць». Фільм-казка. 1-я і 2-я серыі.**
**12.20 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі: «Каханне зямное». Драма.**
**13.50 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі: «Лёс». Драма.**
**16.30 «Гваздзік». Драма.**
**17.25 «Тры залатыя валасы». Фільм-казка.**
**19.00 «Дон Кіхот». Драма.**
**20.45** «Калыханка».
**21.00** Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
**21.55** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**22.50** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Андрэй Сянькевіч.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Сычык без ліцэнзіі».**
**10.40 Серыял «Ландыш серабрысты».**
**12.15 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**14.40 Фільм-катастрофа «Паслязаўтра».**
**17.55, 0.20 Серыял «Віртуозы».**
**18.55 Серыял «Інтэрны».**
**20.00** «Хачу ў тэлевізар».
**20.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**21.00** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Косці».**
**23.30 Фэнтэзі «Усемагутныя Джонсаны».**

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 2.50** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Байзонс».
**9.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Ханты-Мансійск. Масстарт. Мужчыны.
**9.55, 18.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Ханты-Мансійск. Масстарт. Жанчыны.
**10.50** Баскетбол. НБА. «Кліперз» — «Нью-Арлеан».
**12.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**14.25** Спартыўная гімнастыка. Кубак свету. Котбус.
**16.25** Хакей. КХЛ. Паўфінал Усходняй канферэнцыі. Сёмы матч. «Сібір» — «Металург» (Магнітагорск).
**19.25** Хакей. КХЛ. Паўфінал Заходняй канферэнцыі. Сёмы матч.
**21.45** Час футбола.
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**23.20** Еўрапейскі покерны тур.
**0.15** Муай-тай. К-1. Сусветны Гран-пры.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Зона загароды. Каля небяспечнай рысы».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Танцуй!».
**0.35** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.50** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.25** «Такі лёс».
**15.15** «Іншая краіна». «Астравы шанцавання: што шукае Беларусь у Інданезіі».
**16.50 «Вовачка 3». Серыял.**
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дакументальны праект»: «Гагарын. Апошні палёт».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30 Маст. фільм «Незабыўныя моманты».**
**1.40** «Дакументальны праект»: «Пад знакам Скарпіёна».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «Год цяляці».**



**11.05 Маст. фільм «Апошняя рэпрадукцыя».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00, 0.25** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.05 Серыял «У свеце міфаў і памылак».**
**14.15 Серыял «Фарфоравае вяселле».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.20, 4.00 Серыял «Таварышы паліцэйскія».**
**19.25 Маст. фільм «Без асаблівых прымет».**
**21.10, 23.15 Серыял «Жураў 2».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.55** «Апошні рамантык контрразведкі».
**12.30** «Мая планета».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Я больш не баюся».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**21.55, 23.10 Серыял «Людміла».**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Ядзім дома».
**14.50, 22.50** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20** «Усё будзе добра!».
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.40 Серыял «Ленінград 46».**
**22.45** «Анатомія дня».
**23.35 Серыял «Мянтоўскія войны».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 20.55, 23.15** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30** «Сёння клюе».
**8.00, 19.50 Серыял «Перавозчык».**
**8.55, 13.50, 15.45, 16.50, 19.30** «Хатняя крама».
**9.00 Серыял «Мерлін».**
**9.50 Драма «Крутыя часы».**
**11.50 Вестэрн «Цёмная даліна».**
**14.10 Серыял «Чарцяня».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**18.30 Серыял «Радзіма».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Меладрама «Забароненае каханне».**
**22.55 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**
**23.20** «Хобі TV».

## ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00** «Я падаю на развод».
**10.00, 19.00** Серыял «Маладзёжка 2».
**11.00** Серыял «Кухня 4».
**12.00** Фэнтэзі «Змярканне».
**14.10, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**16.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**20.00** Серыял «Святлафор 5».
**21.10** Баявік «Агент пад прыкрыццём».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**20.50** «Тым часам».
**21.35** «Правілы жыцця».
**22.00** Навука без межаў. «Работы сярод нас». Дак. фільм.
**23.00** «Нямухінскія маналогі». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
**23.50** «Дзель і яго мяжа». Дак. фільм.
**1.00** «Кінескоп». Французскае кіно.
**2.35** «Сусветныя скарбы культуры».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.10** «Лінія жыцця». Марына Зудзіна.
**13.10** «Ядзернае каханне». Дак. фільм.
**14.05, 1.40** «Пецярбургскія тайны». Серыял.
**15.10** Да 85-годдзя Сімона Шноля. «Ад 0 да 80». Дак. серыял. 1-я і 2-я серыі.
**16.00** «Чалавек, якога я кахаю». Маст. фільм.
**17.30** Шэдэўры эпохі рамантызму. А. Дворжак. Сімфонія № 8.
**18.15** Да 110-годдзя з дня нараджэння Рыгора Козінцава. «Астравы».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Саці. Нясумная класіка...» Святаславу Рыхтэру прысвячаецца...
**20.10** «Добрай ночы, малыя!».
**20.25** «Марына Няёлава. Гэта было. Гэта ёсць... Фаіна Ранеўская». Частка 1-я.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 13.30, 19.30, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**6.55, 8.50, 9.50, 10.20, 11.45, 13.10, 14.30, 15.40, 16.35, 19.05, 20.25, 20.45, 21.40, 23.30, 0.55, 1.25, 1.45, 2.45, 3.40, 5.25** Музычная настальгія.
**7.10** «Акулы пяра». Анатоль Крупноў. 1997 год.
**8.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Тбілісі-80». 2005 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.10, 20.40, 1.35** «Сядзі і глядзі». 2004 год.
**10.50** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар: Турыянскі Уладзімір. 2007 год.
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «БГ. Доўгая дарога дадому». 2006 год.
**14.40** «Назад у СССР» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Замежнае кіно». 2008 год.
**15.50** «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Градскі. 2007 год.
**16.45** «Канцэрт Яўгена Клячкіна». 1-е аддзяленне. 1990 год.
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дыскатэкі 80-х». 2005 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**23.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт групы «Ліга блюзу» ў Тэатры эстрады.1993 год.
**0.00** «Назад у СССР» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Нараджэнне рэкламы». 2008 год.
**1.10** «Паэт Станіслаў Красавіцкі чытае свае вершы». Частка 2. 2005 год.
**2.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 1-я частка. Паўтор ад 2009 года.
**4.00** «Колба часу».
**5.00** «Атланты трымаюць неба». «Васільеўскі востраў». 2010 год.

## EUROSPORT

**3.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**10.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**11.30** Настольны тэніс. Фіналы.
**13.30, 16.30, 23.00** Велаcпорт. Мілан — Сан-Рэма.
**14.30, 20.15, 0.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**15.30, 21.30, 1.45** Біятлон. Кубак свету.
**17.30, 2.45** Велаcпорт. Нацыянальны тур Каталоніі.
**19.15, 22.45** WATTS.
**19.30** Футбол. Еўрагалы.
**0.30** Конны спорт. Скачкі.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.15** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Увесь я».
**8.25** Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
**9.40, 14.25, 15.15, 19.55, 22.45, 0.55, 3.00, 5.25** Скетчком «Паміж намі».
**10.45** Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
**12.25** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Брат і сястра».
**18.20** Камедыя «Гамбіт».
**20.20** Прыгоды «Цудоўная чацвёрка».
**23.10** Прыгоды «Ас з асаў».
**1.15** Прыгоды «Замуж на 2 дні».
**4.00** Меладрама «Лічбавае каханне».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Доктар І.».
**8.30, 18.40, 1.00** «Эзель». Серыял.
**10.00, 4.50** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45, 17.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40, 16.45** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.35** «Ружа развітальных вятроў».
**15.15, 22.35** «Зорныя гісторыі».
**16.15, 5.35** «Нераскрытыя тайны: Факультатыў. Гісторыя».
**20.40** «Каханне за каханне». Серыял.
**21.40, 0.15** «Мар'ін гай». Серыял.
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.35** «Аўрора». Серыял.

## TV 1000 ТБ1000

**6.00, 15.45** Камедыя «Голы кароль».
**7.45, 4.00** Баявік «Патрыёт».
**10.30** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**12.00** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Світанак: Частка 2».
**14.00** Драма «Скарб».
**17.30** Драма «12 гадоў рабства».
**20.00** Драма «Месца пад соснамі».
**22.30** Камедыя «Уік-энд у Парыжы».
**0.15** Драма «Паляўнічы».
**2.00** Меладрама «Сумны Валянцін».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**7.40** Казка «Вечары на хутары бліз Дзіканькі».
**8.50** Драма «Рэжым поўнага апускання».
**10.40** Драма «Гутарка».
**12.00** Драма «Злачынства і пакаранне».
**15.40** Камедыя «Ёлкі 3».
**17.20** Меладрама «Грэчаскія канікулы».
**18.55** Баявік «22 хвіліны».
**20.20** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
**21.55** Драма «Дубровскі».
**0.10** Драма «Шагал — Малевіч».
**2.20** Камедыя «Перцы».
**4.35** Фантастыка «Пісьмы мёртвага чалавека».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 13.50** Займальная навука.
**6.22** Гульні розуму.
**6.43, 12.40, 18.44, 22.30, 2.17, 5.15** Зрабі або памры.
**7.28, 13.27, 19.06, 22.53, 2.39, 5.37** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50, 13.50** Кіраванне натоўпам.
**8.13, 21.45, 23.16, 1.32, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**9.42, 14.12, 19.30** Гісторыя ежы.
**10.27, 14.57, 20.15** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.10** Мегазаводы.
**11.56** Старацелі.
**15.43** Царкракадзілаў.
**16.28** Небяспечныя сустрэчы.
**17.13** Паветраныя асы вайны.
**17.59** Нямецкая армія Чэрчыля.
**21.00, 0.47, 3.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**0.01** У пагоні за НЛА.
**3.02** Выратавальны атрад.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Разбуральнікі легенд.
**9.40, 13.50** У пагоні за класікай.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на склады.
**13.00, 22.10, 6.25** Голыя і напалоханыя.
**14.40, 5.35** Што было далей?
**16.20, 19.40, 4.00** Хуткія і гучныя.
**17.10, 4.50** Вялікі махінатар.
**18.50** Мяцежнікі ледзянога возера.
**20.30** Дылетант супраць эксперта.
**23.00** Беар Грылс: выправаванне страхам.
**23.50** Гульня на жыццё.
**0.40, 3.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## СУБОТА, 28 САКАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.55** Існасць.
**7.20 Драма «Пяць гадоў і адзін дзень».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50** Кулінарная дыпламатыя.
**10.20, 23.40 Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».**
**11.20** «Пра ежу!».
**12.10** Дача.
**12.45** Гісторыі рамонту.
**13.15** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.50, 0.45** «Вялікая розніца».
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.35 Меладрама «Самая прыгожая 2». 1—4-я серыі.**
**19.00** «Я магу!» Народнае шоу. Паўфінал.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Я магу!» Народнае шоу. Падвядзенне вынікаў.
**21.50 Меладрама «Берагі кахання».**
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00 Камедыя «Кошкі-мышкі».**
**8.55** Беларуская кухня.
**9.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**10.20** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**10.50** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара».
**11.45, 21.10** Тэлебарометр.
**11.50** Хачу ў тэлевізар!
**11.55** Капейка ў капейку.
**12.30** «Экстрасэнсы вядуць расследаванне».
**13.45** Вось гэта дзіва!
**14.20 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**16.50 Да 70-годдзя Перамогі. Драма «У чэрвені 41-га...». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Спортлато 6 з 49.
**21.05** КЕНО.
**21.15** Да 70-годдзя Перамогі. «Дзённікі беларускага падполля».
**21.50 Да 70-годдзя Перамогі. Кінааповесць «Заўтра была вайна».**
**23.35** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**0.15 Драма «Ціхая застава».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.40, 14.30, 16.40, 23.40** Калейдаскоп.
**7.50 «Чараўнік Лала». Фільм-казка.**
**9.00 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі: «Шчыт і меч». Маст. фільм. 1-я — 4-я серыі.**
**14.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.10 «Дзень поўні». Драма.**
**16.50** Сустрэчы на Чырвонай, 4. Дзмітрый Смольскі.
**18.00** «Дыя@блог P.S.».
**18.25 «Выхаванне жорсткасці ў жанчын і сабак». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.00 «Багема». Драма.**
**23.15** «Раман з лёсам». Спыніся і глядзі. Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**2.35** Баскетбол. НБА. «Бруклін» — «Кліўленд».
**5.00, 5.25** PRO спорт. Навіны.
**5.30, 19.20** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Адвольная праграма. Жанчыны.
**9.30** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Лісабон.
**12.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Адвольная праграма. Мужчыны.
**16.55** Хакей. КХЛ. Фінал Заходняй канферэнцыі. Другі матч.
**22.05** Піт-стоп.
**22.35** Еўрапейскі покерны тур.
**23.30** Тэніс. Турнір ВТА. Маямі.
**3.05** Баскетбол. НБА. «Чыкага» — «Нью-Ёрк».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** Да юбілею акцёра. «Інакенцій Смактуноўскі. За мяжой розуму».
**13.50 Маст. фільм «Тайны палацавых пераваротаў. Завяшчанне імператрыцы».**
**15.20** «Рассмяшы коміка».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20 Камедыя «Формула кахання».**
**18.05** «100 мільёнаў».
**19.00 Камедыя Леаніда Гайдая «Каўказская палонніца, або Новыя прыгоды Шурыка».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**23.05** «Легенды Live». «Scorpions».
**23.50** «Што? Дзе? Калі?».

### СТБ

**6.15 Камедыя «Татулі».**
**7.45** «Тайны свету».
**8.40** «Прыгоды дылетанта».
**9.10** «Разумней не прыдумаеш».
**10.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Гэта — мой дом!».
**12.05, 0.55 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: сабака Баскервіляў». 1-я серыя.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Вам і не снілася»: «Тайны зніклых караблёў».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.20** «На тым жа месцы ў той жа час».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Трылер «Я — легенда».**
**22.00** «Зорны рынг. Бітва кавер-бэндаў».
**23.15** «Дакументальны праект»: «Зорныя шэпты».

### МІР

**6.00, 8.40, 5.10** М/ф.
**8.10** «Саюзнікі».
**9.05** «Скажыце, чаму?».
**9.30** «Ой, мамачкі!».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Тайна «Чорных драздоў».**
**13.10 Маст. фільм «Тэрэза Д».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Каралі гульні».**
**21.55 Маст. фільм «Шырлімырлі».**
**0.25 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».**
**2.20 Серыял «З нагоды».**
**3.15 Маст. фільм «Волга-Волга».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «ХА». Маленькія камеды.
**7.50 Маст. фільм «Белыя ружы надзеі».**
**11.00, 14.00 .**
**11.10** «Планета сабак».
**11.45** «Суботнік».
**12.25 Маст. фільм «Пятроўка, 38».**
**14.25 Маст. фільм «Падары мне крыху цяпла».**
**16.10** «Пакой смеху».
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45 Маст. фільм «Любоў і Раман».**
**22.30** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2015.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Профіль забойцы».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Горад-забойца».
**14.20 Серыял «Версія».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Следства вялі».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00 Маст. фільм «Кроўныя браты».**
**0.40** «Сапраўдны італьянец». «Кіно па-італьянску».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.40, 19.00, 20.55, 23.20** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.25 Серыял «Радзіма».**
**11.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.45, 15.45** «Хатняя крама».
**12.00 Драма «Стралец непрыкаяны».**
**13.45 Баявік «Сціралець».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.35 Камедыя «Скубі-Ду».**
**18.10 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.05 Камедыя «Выпадковы муж».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Фантастыка «Праметэй».**
**23.25** «Хобі TV».

---

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хатняя кухня».
**12.30** Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
**15.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.30** Меладрама «Зрабіць крок».
**17.15, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** «Імперыя ілюзій».
**21.10** Меладрама «Зрабі крок: лаві момант».
**23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі Хэ».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Жорсткі раманс». Маст. фільм.
**12.25** Вялікая сям'я. Раман Карцаў.
**13.20** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**13.50** 90 гадоў з дня нараджэння Інакенція Смактуноўскага. «Іваноў». Пастаноўка Алега Яфрэмава. Запіс 1981 года.
**16.40** «МХАТчыкі. Інакенцій Смактуноўскі».
**17.05** «Гамлет». Маст. фільм.
**19.30** «Тыя, з якімі я...». «Інакенцій Смактуноўскі».
**20.25** «Рамантыка рамanса». Нані Брэгвадзэ.
**21.20** Да 75-годдзя Аляксандра Прошкіна. «Лінія жыцця».
**22.10** «Цуд». Маст. фільм.
**0.00** «Таке 6» у Маскве.
**1.05** «Зог і нябесныя рэкі». Дак. фільм. Частка 1- я.
**1.55** «Шукальнікі». «Скарб Сценькі Разіна».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Кінамузыка». 2006 год.
**7.15, 8.25, 8.40, 9.40, 10.20, 11.35, 12.55, 13.20, 13.50, 14.45, 15.40, 17.25, 18.55, 22.10, 22.40, 23.50, 03.40, 5.45** Музычная настальгія.
**7.30, 10.00, 18.00, 0.55, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**8.40** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**11.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**12.00** «Назад у СССР» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Рэчы, якія зніклі з нашага побыту». 2008 год.
**13.10** «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2-я частка. 2005 год.
**13.40, 22.00** «Сядзі і глядзі». 2004 год.
**14.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 2-я частка. Паўтор ад 2009 года.
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Атланты трымаюць неба». «Шасцідзесятыя, якія спяваюць». 2010 год.
**19.10** «Акулы пяра». Уладзімір Праснякоў. 1998 год.
**20.00** «Сустрэча сяброў». 1-я частка. 2007 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.30** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**23.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар: Ларыса Галубкіна. 2008 год.
**0.00** «Акулы пяра». Валерый Лявонцьеў. 1993 год.
**2.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Дзіцячыя песні». 2007 год.
**5.00** «Я сама». Тэма: «Я такая непрыгожая». 1995 год.

### EUROSPORT

**10.30, 17.00, 2.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Каталоніі.
**11.30** Веласпорт. Е3 Харальбеке.
**13.00, 14.30, 1.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.
**19.15, 0.15** Снукер. Чэмпіянат Плэерс. Фінал.
**21.00** Спідвей. Лепшыя пары «Еўраспорт».
**0.00** Ралі-Рэйд.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.55, 20.00, 22.00, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
**8.25** Камедыя «Муж дзвюх жонак».
**10.45** Камедыя «Шосты элемент».
**12.25** Камедыя «На рыбалку!».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.15, 22.45, 0.50, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».
**18.15** Камедыя «Вучань Дзюкабіо».
**20.20** Камедыя «Нацыянальны гольф і малакасосы».
**23.10** Камедыя, баявік «Кілеры».
**1.15** Камедыя «Выкрутасы».
**4.00** Камедыя «Загадана ажаніцца».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Нераскрытыя тайны».
**11.00** «Procіно».
**11.15** «Хронікі маскоўскага быту».
**12.05** «Гісторыі выратавання».
**12.40, 0.45** «Вяртанне агента». Серыял.
**16.05** «Без тэрміну даўнасці».
**17.05** «Міністэрства аховы здароўя папярэджвае». Дак. фільм.
**18.40** «Паляванне на піранню». Маст. фільм.
**21.00** «Мы купілі заапарк». Маст. фільм.
**23.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.45** «Аўрора». Серыял.

### ТБ1000

**7.30, 14.40** Меладрама «Жорсткія гульні».
**9.05** Драма «Дзіця з Марса».
**10.50** Драма «Некалькі добрых хлопцаў».
**13.10** Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
**16.25** Прыгоды «Космаполіс».
**18.10** Драма «Дарыян Грэй».
**20.00** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**22.15** Фантастыка «Людзі ў чорным 2».
**0.00** Трылер «Без кампрамісаў».
**1.45** Драма «Калі я паміра-ла».
**3.45** Драма «Буш».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Злачынства і пакаранне».
**10.10** Меладрама «Грэчаскія канікулы».
**11.40** Камедыя «Перцы».
**13.20** Камедыя «Саламяны капялюшык».
**15.40** Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай поспех».
**17.20** Камедыя «Кур'ер з «Раю».
**18.55** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
**20.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**22.35** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
**0.15** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
**1.50** Драма «Агні прытона».
**3.45** Драма «Палёты ў сне і на яве».
**5.20** Дэтэктыў «Пярэварацень у пагонах».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 8.35** Займальная навука.
**6.22, 17.13** Гульня ў лікі.
**6.43** Зрабі або памры.
**7.28, 8.57, 18.00, 19.05, 20.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50** Гульні розуму.
**9.19, 10.27, 12.40, 16.28** Кіраванне натоўпам.
**9.42** Космас: Прастора і час.
**11.11** Голая навука.
**11.56** Больш чым фокусы.
**13.27** Канвоі: бітва за Атлантыку.
**14.12** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.57** Дзікая прырода Расіі.
**15.43** Узыходжанне чорнага ваўка.
**21.00, 0.47, 3.45** Расследаванні авіякатастроф.
**22.31, 5.15** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**23.16, 2.17** Камета стагоддзя.
**0.01, 3.02** Сонечнае зацьменне.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.35** Вулічныя гонкі.
**8.50, 15.30** Геній аўтадызайну.
**9.40, 16.20, 6.25** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**10.30** Брыстальскі заліў.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Скарбы з каморкі.
**13.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.40** Бітва за нерухомасць.
**18.00** Вялікі махінатар.
**23.00** Беар Грылс: выпрабаванне страхам.
**23.50** Дылетант супраць эксперта.
**0.40** Сібірская рулетка.
**1.30** Голыя і напалоханыя.
**2.20** Хуткія і гучныя.
**3.10** На краі Аляскі.
**4.50** Як гэта ўстроена?
**5.10** Як гэта зроблена?
**7.10** Хаос у дзеянні.

---

## МУЖЧЫНАМ — БАЕВІКІ, ЖАНЧЫНАМ — МЕЛАДРАМЫ

**Пошукавік «Яндэкс» апублікаваў звесткі аб тым, якімі фільмамі і акцёрамі найбольш цікавіліся беларускія мужчыны і жанчыны ў мінулым годзе.**

Самай папулярнай «зоркай» кіно ў беларускіх жанчын стала Джэніфер Лоўрэнс, якая сыграла галоўную ролю ў карціне «Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца. Частка I». Мужчын больш за ўсё цікавіў Він Дызель — герой баевікоў «Рыдык» і «Фарсаж». Пра гэта сведчаць даныя сэрвісу «КиноПоиск», які належыць «Яндэксу».

Для параўнання перавак былі складзены спісы з 50 найбольш папулярных «зорак» кіно — у мужчынскай і ў жаночай аўдыторыях. Высветлілася, што і мужчын, і жанчын у 2014 годзе больш цікавілі акцёры, чым актрысы. Найбольшую ўвагу моцнага полу прыцягнулі Він Дызель («Фарсаж»), Крыстэн Сцюарт («Змярканне») і Джэйсан Стэтхэм («Нястрымныя-3»). А жанчыны хацелі ведаць пра Джэніфер Лоўрэнс («Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца. Частка I»), Анджаліну Джолі («Малефісента») і Леанарда Ды Капрыа («Воўк з Уол-стрыт»). Цікава, што ў мужчын Анджаліна Джолі не ўвайшла нават у топ-20, а Він Дызель не трапіў у жанчын і ў топ-50.


«Інтэрстэлар».

З 50 самых папулярных у жаночай і ў мужчынскай аўдыторыі фільмаў дзве трэціны супадаюць. А вось сярод карцін, якія ўвайшлі толькі ў адзін са спісаў, у мужчын пераважаюць, само сабой, баевікі і фантастыка, а ў жанчын — драмы і меладрамы. У мужчынскім рэйтынгу папулярнасці лідзіруюць «Інтэрстэлар», «Воўк з Уол-стрыт» і «Вартавыя Галактыкі». Жанчыны больш за ўсё цікавіліся фільмам «Пяцьдзясят адценняў шэрага», які надаўна выйшаў у пракат. За ім ідуць «Інтэрстэлар» і «Дывергент». Цікава, што «Вартавыя Галактыкі» не трапілі ў топ-50 у жанчын, а «Пяцьдзясят адценняў шэрага» — у топ-50 у мужчын.

